Нацыянальны інстытут адукацыі

# Кампетэнтнасны падыход

В. У. Праскаловіч, Т. У. Логінава

# Беларуская літаратура

# 11

клас

## Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы

(базавы і павышаны ўзроўні)

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

М а з ы р
«Выснова»
2 0 2 1

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫКАРЫСТАННІ ДЫДАКТЫЧНЫХ І ДЫЯГНАСТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

У зборніку ўпершыню даюцца дыдактычныя і дыягнастычныя кампетэнтнасна арыентаваныя заданні па беларускай літаратуры для 11-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

Выкарыстанне кампетэнтнасна арыентаваных заданняў на ўроках беларускай літаратуры дазваляе правесці маніторынг сфарміраванасці прадметных кампетэнцый навучэнцаў. Універсальным маніторынгавым інструментам сфарміраванасці прадметных кампетэнцый навучэнцаў з'яўляюцца інтэграваныя кампетэнтнасна арыентаваныя заданні, якія дазваляюць праверыць некалькі відаў кампетэнцый рознага ўзроўню.

Асноўныя прынцыпы распрацоўкі маніторынгавых кампетэнтнасна арыентаваных заданняў:




Маніторынгавыя кампетэнтнасна арыентаваныя заданні распрацаваны паводле наступнай мадэлі-схемы:

- стымул;
- крыніца інфармацыі (тэксты, табліцы, схемы, ілюстрацыі і г. д.);
- заданні (пытанні) па рабоце з гэтай інфармацыяй;
- бланк для выканання задання;
- інструмент праверкі.

Выкарыстанне кампетэнтнасна арыентаваных заданняў у адукацыйным працэсе дазволіць настаўніку вырашыць адначасова некалькі задач:

- выявіць узровень развіцця інфармацыйнай кампетэнцыі навучэнцаў, г. зн. наколькі вучань у стане разабрацца ў тэксце і выбраць з яго неабходную інфармацыю;
- ацаніць узровень развіцця прадметных ведаў і ўменняў;
- вызначыць узровень развіцця ўніверсальных вучэбных дзеянняў (УВД);
- даць ацэнку здольнасці самастойна набываць веды і выбіраць спосабы дзейнасці, неабходныя для дасягнення пастаўленай мэты ў заданні;
- фарміраваць пазнавальную цікавасць да прадмета праз развіццё даследчай кампетэнцыі;
- павысіць матывацыю да вучэбнага прадмета.

## Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні кампетэнтнасна арыентаваных заданняў выніковага кантролю

Нарматыўныя дакументы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжваюць правядзенне *паўрочнага* (на кожным уроку), *тэматычнага* (пасля вывучэння пэўнай тэмы), *прамежкавага* (пасля вывучэння раздзела або ў канцы чвэрці, трыместра) і ***выніковага*** (пасля вывучэння курса пэўнага класа ў канцы навучальнага года) ***кантролю*** вучэбных дасягненняў вучняў.

Вышэйназваныя віды кантролю адрозніваюцца: аб’ёмам вучэбнага матэрыялу, які з’яўляецца аб’ектам кантролю (выніковы кантроль — матэрыял курса, які вывучаўся ў навучальным годзе); узроўнем абагульнення і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу, які патрабуецца для выканання заданняў.

У дапаможніку прапанаваны *кампетэнтнасна арыентаваныя заданні для правядзення выніковага кантролю* па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» ў 11-м класе (базавы і павышаны ўзроўні).

У вучэбных праграмах па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура. 11 клас» (базавы, павышаны ўзроўні) у раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў» пералічаны *асобасныя, метапрадметныя і прадметныя вынікі навучання*.

Сярод апошніх адно з найважнейшых — уменне аналізаваць літаратурны твор: вызначаць яго прыналежнасць да пэўнага літа-

ратурнага мастацкага напрамку, роду і жанру; выяўляць асноўную праблематыку твора; адметнасці стылю (творчай індывідуальнасці) пісьменніка; характарызаваць героя твора, супастаўляць герояў аднаго або некалькіх твораў; абгрунтоўваць сваю ацэнку прачытанага твора, разумець аўтарскую пазіцыю.

***Плануемыя вынікі***

У выніку выкарыстання прапанаванай сістэмы кампетэнтнасна арыентаваных заданняў у навучэнцаў павысіцца: узровень сфарміраванасці прадметных кампетэнцый; узровень развіцця творчай і пазнавальнай актыўнасці; матывацыя да вывучаемага прадмета.

**Індыкатары сфарміраванасці кампетэнцый навучэнцаў**




У дапаможніку прыведзены кампетэнтнасна арыентаваныя заданні, накіраваныя на сістэматызацыю і абагульненне ведаў вучняў 11 класа (базавы і павышаны ўзроўні) па пройдзенай тэме, раздзеле вучэбнага дапаможніка.

Матэрыял курса 11 класа (базавы і павышаны ўзроўні), які вывучаўся ў навучальным годзе, падаецца наступнымі блокамі-раздзеламі:

*раздзел 1* — «Беларуская літаратура перыяду 1960-х — пачатку 1990-х гадоў»;

*раздзел 2* — «Сучасная беларуская літаратура».

У адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам, які скіроўвае на прымяненне вынікаў навучання ў жыццядзейнасці, кантэкст большасці заданняў сфармуляваны ў дзейнасна-практычным аспекце.

Асноўныя тыпы заданняў прадстаўлены не дысперсна, а аб'яднаны ў *модулі*, кожны з якіх дазваляе якасна і эфектыўна выявіць узровень сфарміраванасці не толькі прадметных (літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная, маўленча-камунікатыўная, культуралагічная і культуратворчая), але і асобасных і метапрадметных кампетэнцый.

Асаблівая ўвага звернута на заданні, якія выяўляюць найперш ўзровень сфарміраванасці ў навучэнцаў *чытацкай пісьменнасці*, пад якой разумеецца здольнасць чалавека разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для рэалізацыі мэт, пашыраць веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці [7].

Чытацкая пісьменнасць з'яўляецца метапрадметным уменнем, бо здольнасць да чытання і разумення вучэбных тэкстаў, уменне здабываць інфармацыю з тэксту, пераасэнсоўваць яе і выкарыстоўваць для вырашэння разнастайных вучэбных і вучэбна-практычных задач патрэбна ў працэсе навучання ўсім без выключэння вучэбным прадметам, а таксама ў самастойным жыцці.

Прапанаваныя заданні рэкамендуецца разглядаць як банк заданняў, з якога настаўнік па сваім меркаванні можа фарміраваць выніковыя праверачныя работы (для пісьмовага кантролю вучэбных дасягненняў вучняў), а таксама выбіраць заданні для правядзення вуснага кантролю.

Колькасць прапанаваных у дапаможніку кампетэнтнасна арыентаваных заданняў дазваляе рэалізаваць індывідуальны падыход да правядзення выніковага кантролю вучэбных дасягненняў вучняў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» ў 11-м класе на базавым і павышаным узроўнях.

Праверачныя работы для правядзення выніковага кантролю на павышаным узроўні абазначаюцца ў тэксце зорачкай (*).

На павышаным узроўні развіццё прадметных кампетэнцый (прадметных уменняў) адбываецца за кошт пашырэння відаў вучэбнай дзейнасці, якія рэалізуюць практыкаарыентаваны характар літаратурнай адукацыі: складанне плана, тэзісаў і канспекта тэксту (мастацкага, публіцыстычнага, навукова-папулярнага і да т. п.), падрыхтоўка вусных выказванняў, міні-паведамленняў, напісанне і абарона рэфератаў, вучэбных праектаў на літаратурную тэму (у тым ліку з мультымедыйным суправаджэннем), вопыты мастацка-творчага характару (мастацкія замалёўкі, апавяданні, нарысы, эсэ, вершы) і інш.

У змесце большасці заданняў вучням прапануецца псеўдажыццёвая або псеўдапрафесійная сітуацыя: экскурсавод у музеі, рэжысёр або акцёр у тэатры, выдавец, журналіст, мастак, сцэнарыст, стваральнік віртуальнага музея, буктрэйлера і г. д. Спецыяльна створаная квазісітуацыя (максімальна набліжаная да рэальнай) не разглядаецца як самадастатковая, г. зн. безадносна да таго літаратурнага матэрыялу, які вывучаецца. Дадзеная сітуацыя заўсёды дэтэрмінавалася патрэбай практычнага прымянення засвоеных спосабаў дзейнасці, іх выкарыстання ў розных відах вучэбнай дзейнасці: прайграванне роляў рэжысёраў (складанне рэжысёрскага плана спектакля), акцёраў (прэзентацыя ўласнага «бачання» выканання адной з роляў), дэкаратараў (распрацоўка эскізаў дэкарацый да асноўных эпізодаў твора), касцюмераў (распрацоўка эскізаў касцюмаў і грыму), кампазітараў (выбар і абгрунтаванне музычнага афармлення), мастакоў (стварэнне ўласных ілюстрацый да твора і супастаўленне іх з ілюстрацыямі прафесійных мастакоў, распрацоўка афіш да спектакля, праграм, запрашальных білетаў у тэатр) і інш.

Практычная вартасць такога матэрыялу заключаецца ў яго скіраванасці на развіццё асобасных, метапрадметных кампетэнцый, рэалізацыю творчага патэнцыялу асобы вучня. Уменні аналізаваць жыццёвыя сітуацыі, адлюстраваныя ў мастацкім творы, і лёсы герояў (учынак і яго светапоглядныя, маральныя, псіхалагічныя матывіроўкі, маральны выбар і яго наступствы для асобы; тыпы тэмпераменту і іх выяўленне ў паводзінах) вучань пераносіць на рэальныя сітуацыі і характары і такім чынам аказваецца падрыхтаваным да сустрэчы з нечаканымі абставінамі ў жыцці.

Такім чынам, прызначэнне кампетэнтнасна арыентаваных заданняў выніковага кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў на заключным этапе літаратурнай адукацыі заключаецца ў наступным: ацаніць здольнасці вучняў выкарыстоўваць набытыя веды, уменні, вопыт для паспяховай сацыялізацыі ў сучасным свеце.

Пры правядзенні кантролю правяраецца ўзровень як тэарэтычных ведаў, так і агульнавучэбных і спецыфічна мастацкіх уменняў.

Значная колькасць прапанаваных заданняў мае на мэце праверку якасці авалодання вучнямі ўніверсальнымі спосабамі дзейнасці (ажыццяўляць бібліяграфічны пошук, карыстацца рознага роду даведачна-інфармацыйнай літаратурай, класіфікаваць інфармацыю, знаходзіць і апрацоўваць неабходную інфармацыю з розных крыніц, уключаючы інтэрнэт, ствараць з дапамогай камп’ютара вучэбныя мультымедыйныя прадукты і інш.). У гэтым выпадку можна

меркаваць не толькі пра выніковасць літаратурнага навучання, але і пра ўзровень развіцця інфармацыйнай культуры (або «электроннай культуры»). Такі падыход павінен забяспечваць магчымасць інфармацыйную культуру вучняў зрабіць неад'емнай часткай вучэбнай дзейнасці, што паспрыяе станаўленню асобы вучня і яе паспяховай адаптацыі ў сучасным тэхналагічным грамадстве.

Выніковыя кампетэнтнасна арыентаваныя заданні распрацаваны для забеспячэння аб'ектыўнага кантролю якасці літаратурнай адукацыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі з улікам базавага і павышанага ўзроўняў вывучэння прадмета.

Пры выстаўленні адзнакі за выкананне заданняў настаўніку неабходна сыходзіць з паказчыкаў ацэнкі вуснага і пісьмовага выказвання ў адпаведнасці з нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура».

# РАЗДЗЕЛ І

# ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ 1960-х — ПАЧАТКУ 1990-х ГАДОЎ

*Заданне*

| | |
|---|---|
| Веданне гісторыі літаратуры, па словах Алега Лойкі, — гэта памятанне прозвішчаў літаратараў, назваў іх твораў і дат напісання, узнятых праблем, ідэй, тэм, асноўнай канцэпцыі жыцця як стрыжня. Гісторыю літаратуры любога народа, любога часу не зразумець таксама без бачання генетычнай іх залежнасці ад эпахальных перыядаў развіцця грамадства. | **Стымул** |
| Назавіце найбольш значныя праблемы, якія асвятляліся ў беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя. Абгрунтуйце іх злабадзённасць. Хто з беларускіх пісьменнікаў другой паловы ХХ ст. вам больш падабаецца? Якія яго творы вы прачыталі? Якія праблемы ў іх закраналіся? У чым вы бачыце іх гуманістычны пафас? | **Задачная фармулёўка** |
| Вучэбны дапаможнік[1], інтэрнэт-рэсурсы. | **Крыніца інфармацыі** |

[1] Тут і далей пададзены старонкі вучэбнага дапаможніка: Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / пад рэд. З. П. Мельнікавай, Г. М. Ішчанкі (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню). — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2021. — 263 с.

## Іван Шамякін. Раман «Сэрца на далоні»

### *Заданне*

| | |
|---|---|
| І. Шамякіна даўно хвалявала тэма беларускага падпольнага руху і гераічнай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сацыяльна-палітычныя падзеі канца 1950-х — пачатку 1960-х гг. падштурхнулі пісьменніка да аб’ектыўнага асэнсавання мінулага. Асноўную сюжэтную лінію рамана «Сэрца на далоні» якраз і ўтварае канфлікт розных, супрацьлеглых поглядаў на дэмакратычныя змены ў жыцці тагачаснага грамадства. | **Стымул** |
| 1. Прыгадайце з урокаў гісторыі, чым пазначаны палітычныя падзеі канца 1950-х — пачатку 1960-х гг. мінулага стагоддзя і іх наступствы для сацыяльна-грамадскага жыцця краіны.<br>2. Як адбілася ў свядомасці і ўчынках герояў рамана рашэнне з’езда партыі аб выкрыцці культу асобы Сталіна?<br>3. Адзін з галоўных герояў рамана, журналіст Кірыла Шыковіч гаворыць: *«Адбыліся такія падзеі! Пераварот у мазгах, у сэрцах!»* Пракаменціруйце думку героя твора з вашай пазіцыі як сучасніка XXI ст.<br>Ці змяніліся адносіны да падзей вайны, яе ўдзельнікаў у грамадстве ў 1950—1960-я гг. і ў наш час?<br>5. У чым актуальнасць рамана «Сэрца на далоні»? | **Задачная фармулёўка** |
| Вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры, па гісторыі. | **Крыніца інфармацыі** |

## *Іван Шамякін. Аповесць «Гандлярка і паэт»

### *Заданне*

| | |
|---|---|
| У аповесці «Гандлярка і паэт» Іван Шамякін звярнуўся да тэмы трагічнага лёсу жанчыны на вайне. На долю жанчын выпала шмат гора і пакут. Яны са зброяй у руках змагаліся на фронце | **Стымул** |

| | |
|---|---|
| побач з мужчынамі, былі санітаркамі, сувязнымі ў партызанскіх атрадах, падпольшчыцамі. Але былі і тыя, што добраахвотна супрацоўнічалі з фашыстамі. Вытокі розных паводзін людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны сталі аб'ектам асэнсавання мастака слова. Аўтар шукае адказ на пытанне: чаму адны людзі ахвяравалі сваім жыццём, а іншыя — сталі здраднікамі. | |
| 1. Паразважайце, чаму галоўнай гераіняй твора аўтар выбраў персанажа з мяшчанскага асяроддзя, неадукаваную, эгаістычную — тыповую камароўскую гандлярку Вольгу Ляновіч.<br>2. Ці лічыце вы наватарствам з'яўленне такой гераіні ў беларускай літаратуры 1970-х гадоў? Чаму?<br>3. Ці сустракаліся вам людзі, надзеленыя якасцямі Вольгі Ляновіч? У чым іх сіла і слабасць? | **Задачная фармулёўка** |
| Вучэбны дапаможнік, тэкст твора. | **Крыніца інфармацыі** |

### *Заданне*

| | |
|---|---|
| Вы ведаеце, што нямецкія ўлады за кожнага забітага нямецкага салдата ці афіцэра каралі мірных жыхароў. Алесь, які пакутуе ад сваёй бяздзейнасці, ад таго, што не мае сувязі з падполлем, забівае нямецкага афіцэра і тым самым ставіць пад пагрозу жыццё Вольгі і яе дачкі. Акрамя таго, гэта забойства дорага абышлося гарадскому падполлю: у час аблавы многія патрыёты трапілі ў рукі гестапа. | **Стымул** |
| Дайце ацэнку ўчынку Алеся. Падмацуйце свае развагі прыкладамі з тэксту. | **Задачная фармулёўка** |
| Вучэбны дапаможнік, тэкст твора, інтэрнэт-рэсурсы. | **Крыніца інфармацыі** |

***Заданне***

| | |
|---|---|
| Гераіня пад уплывам Лены Бароўскай выправілася ў лагер, каб выратаваць ваеннапалоннага. Але пры гэтым яна мела і ўласны інтарэс: знайсці гаспадара ў хату і пры гэтым пазбегнуць заляцанняў паліцаяў. | **Стымул** |
| 1. Чаму Вольга Ляновіч зрабіла такі нечаканы выбар, які не супадаў з яе планамі?<br>2. Як гэты выбар характарызуе гераіню?<br>3. Патлумачце выраз *«хоць звычайна палонныя робяцца падобнымі, як браты»* і падрыхтуйце некалькі тэзісаў у абарону чалавечай годнасці салдат, якія апынуліся ў лагеры. | **Задачная фармулёўка** |
| Вольга, наблізіўшыся да самага дроту, глядзела на дваіх. Яны стаялі за тры крокі ад яе, такія ж нерухомыя, як усе, і вельмі не падобныя адзін на аднаго, хоць звычайна палонныя робяцца падобнымі, як браты. Высокі, гадоў пад трыццаць, мужчына, зарослы чорнай барадой, глядзеў з надзеяй, з маленнем, з прагнасцю галоднага і з верай, што ён адзін мае права на тое, каб жыць, каб яго ўратавалі. Сусед яго, ніжэйшы ростам, вельмі схудалы, быў зусім малады, юнак, у яго і барада яшчэ не расла, а таму зжаўцелы твар ажно свяціўся. І вочы дзіўна гарэлі, вялікія, здалёк відаць — блакітныя. Глядзеў ён без надзеі, але з нейкай як бы радаснай дзіцячай цікаўнасцю, нібы ўбачыў, раптоўна адкрыў зусім іншы свет, іншых людзей, якіх ніколі і не марыў убачыць, і гэта дало яму найвялікшую радасць перад смерцю. Ён натужліва закашляўся, ад кашлю ў вачах заіскрыліся слёзы, а шчокі хваравіта запунсавелі. Кашляючы, ён прыкрываў рот далоняй, быццам знаходзіўся ў добрай жаночай кампаніі і саромеўся сваёй слабасці, потым папраўляў закручаную на шыі чорную абмотку, так, як, напэўна, папраўляў некалі шыкоўны шалік. Пасля таго як ён закашляўся і як засаромеўся свайго кашлю, Вольга глядзела ўжо толькі на яго, іншых не бачыла.<br>— Жанчына, вазьмі мяне, я ўсё ўмею рабіць, сталяр, слесар, шавец, — глухім прастуджаным голасам папрасіў барадаты, калі вартавы адышоўся ўбок. | **Крыніца інфармацыі** |

| | |
|---|---|
| Ды Вольга ўжо ведала, што ўзяць яна можа толькі гэтага, які кашляе і ўвесь свіціцца, як святыя мошчы, і які, безумоўна, яшчэ і аднае ночы ў гэтым халодным пекле не пражыве. Можа быць, што яна папрасіла яго вачамі: скажы ж што-небудзь, хоць адно слова.<br>Ён сказаў:<br>— Мяне не бяры. Я нічога рабіць не ўмею.<br>Тады яна закрычала як спрасонку, ажно вартавы, страціўшы свой спакой, імкліва павярнуўся да яе:<br>— Адась! Адасечка! Родненькі мой! Што з табою сталася? Гаротнічак мой! А цябе ж дочачка мая чакае! — і паказала вартавому так, як вучыла яе Лена. — Пан, пане, муж. Муж! | **Крыніца інфармацыі** |

## *Заданне*

| | |
|---|---|
| Гераіня твора не збіралася ўступаць у які-небудзь канфлікт з акупацыйнымі ўладамі, больш за тое, лічыла, «што і пры немцах жыць можна, калі не быць дурнем, гандлёвай справе нават больш прасторы, чым пры Саветах». | **Стымул** |
| Пералічыце абставіны і прычыны, пад уплывам якіх Вольга Ляновіч становіцца адным з самых карысных і актыўных удзельнікаў падпольнай групы, умелай і смелай сувязной.<br>Па-першае, ...<br>Па-другое, ...<br>Па-трэцяе, ... | **Задачная фармулёўка** |
| Вучэбны дапаможнік, тэкст твора, інтэрнэт-рэсурсы. | **Крыніца інфармацыі** |

## **Заданне*

| | |
|---|---|
| У 1978 годзе па аповесці Івана Шамякіна «Гандлярка і паэт» на кінастудыі «Мосфильм» вядомым рэжысёрам Самсонам Самсонавым быў зняты мастацкі фільм «Торговка и поэт». Сцэнарый да фільма напісаў Іван Шамякін. Галоўныя ролі выконвалі Наталля Андрэйчанка, Віктар Жыганаў, Віктар Паўлаў, Стэфанія Станюта і іншыя. | **Стымул** |

| | |
|---|---|
| 1. Паглядзіце мастацкі фільм «Торговка и поэт».<br>2. Выкажыце сваё ўражанне ад экраннай інтэрпрэтацыі аповесці:<br>• сюжэт (звярніце ўвагу на адрозненні ў аповесці і фільме);<br>• падбор акцёраў (ці такімі вы ўяўлялі герояў? Каго, на ваш погляд, можна было б прапанаваць на галоўныя ролі з сучасных акцёраў і чаму?);<br>• акцёрская работа (што акцёры хочуць данесці да гледача? Хто з герояў у сваёй ролі падаўся вам больш пераканаўчым?).<br>3. Прааналізуйце асноўныя эпізоды фільма.<br>4. А́цаніце музыку да фільма кампазітара Эдуарда А́рцем’ева.<br>5. А́ўдыторыі якога ўзросту, на ваш погляд, неабходна паглядзець гэты фільм?<br>6. Параўнайце свае эмоцыі ад знаёмства з аповесцю і прагляду мастацкага фільма. | **Задачная фармулёўка** |
| Інтэрнэт-рэсурсы. | **Крыніца інфармацыі** |

***Заданне***

| | |
|---|---|
| Пейзаж у творах Івана Шамякіна нясе вялікую псіхалагічную нагрузку: дапамагае раскрыць настрой герояў, перадае іх пачуцці. Прырода сугучна перажыванням герояў, як бы адцяняе гэтыя пачуцці, становіцца ўдзельнікам маральна-псіхалагічнай сітуацыі ці выступае як каментарый да гэтых перажыванняў або падзей.<br>Напрыклад, лепш адчуць настрой героя твора «Сэрца на далоні» Кірыла Шыковіча дапамагае апісанне водару сухога сена: *«Сухое сена (на ўзгорку ляжалі першыя пакосы) разлівала далёка навокал не толькі густы водар, які п’яніў, але і асаблівую цяплынь, якая ўзнімала настрой, будзіла фантазію, уяўленні і ўспаміны маленства. Млявасць была ад нечага іншага,* | **Стымул** |

| | |
|---|---|
| *можа, ад тонкага водару кветак ці едкага паху выкінутых на бераг водарасцяў, ілу і малюскаў... Апынуўшыся на высокім беразе над вірыстай плынню, ён узмахнуў рукамі, быццам жадаючы паляцець, прагна ўдыхнуў начную прахалоду і ад захаплення галёкнуў: “Хараство-о-о!”»* | **Стымул** |
| Паразважайце, якая роля ў творы Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» адводзіцца апісанню луга. | **Задачная фармулёўка** |
| «Жанчыны ішлі да дубоў, за якімі іскрылася тысячамі сонцаў даўгаватае люстра вады. Гэта старыца ракі. Самой ракі не відаць, у незапомныя часы яна адступіла ад лесу на добры кіламетр. Відзен толькі чырвоны слуп ліхтара на беразе.<br>Луг не роўны і не гладкі, ён перарэзаны старыцамі-раўчакамі, канавамі, берагі якіх зараслі лазняком, на ўзгорках стаяць дубы, у зарэчнай далечы сінее лес, злева з-за хмызнякоў выглядаюць стрэхі хат. Але ўсё адно нідзе, нават у самым шырокім полі, няма такога адчування прасторы і неабсяжнасці, як тут, асабліва калі глядзець вось з такой вышыні. Дзіўна, што неба тут таксама здаецца вышэй, чым дзе ў іншым месцы. І бачыш усё адразу: зялёную зямлю і блакітнае неба. І ваду. Няхай мала яе, але яна адлюстроўвае ўсё — неба і дубы. А павярніся назад і ўбачыш яшчэ адно дзіва прыроды — лес. Цудоўны бор — сасна ў сасну — абступаў невялікую абжытую паляну. Злева, бліжэй да ручая, што аддзяляў лес ад лугу, сосны саступалі месца дубам-асілкам, якіх нямнога засталося ў нашых лясах. Каля самага бору туліліся старыя будынкі лясніцтва — кантора, хаты ляснічага, лесніка, канюшня». | **Крыніца інфармацыі** |

# ЗМЕСТ

*Прадмова* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні дыдактычных і дыягнастычных матэрыялаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні кампетэнтнасна арыентаваных заданняў выніковага кантролю . . . . . . . . . . . . . 8

**РАЗДЗЕЛ I**
**ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**

**Беларуская літаратура перыяду 1960-х — пачатку 1990-х гадоў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Іван Шамякін. Раман «Сэрца на далоні» . . . . . . . . . . . . . . . 13
Іван Шамякін. Аповесць «Гандлярка і паэт» . . . . . . . . . . . 14
Васіль Быкаў. Аповесць «Знак бяды» . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Васіль Быкаў. Аповесць «Абеліск» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Уладзімір Караткевіч. Раман «Каласы пад сярпом тваім» . . . . . 30
Міхась Стральцоў. Апавяданне «Сена на асфальце» . . . . . . . . . 35
Міхась Стральцоў. Апавяданне «На чацвёртым годзе вайны» . . . 36
Ніл Гілевіч. Лірыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Ніл Гілевіч. Раман у вершах «Родныя дзеці» . . . . . . . . . . . . 39
Іван Чыгрынаў. Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» . . . . . 42
Георгій Марчук. Навела «Канон Гарыні» . . . . . . . . . . . . . . . 43
Аляксей Дудараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Аляксей Дудараў. П’еса «Князь Вітаўт» . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Міхась Башлакоў. Лірыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
**Сучасная беларуская літаратура** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50

**РАЗДЗЕЛ II**
**ДЫЯГНАСТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**

**Беларуская літаратура перыяду 1960-х — пачатку 1990-х гадоў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Іван Шамякін. Раман «Сэрца на далоні» . . . . . . . . . . . . . . . 56
Іван Шамякін. Аповесць «Гандлярка і паэт» . . . . . . . . . . . . 57
Андрэй Макаёнак. «Зацюканы апостал» . . . . . . . . . . . . . . . 58
Васіль Быкаў. Аповесць «Знак бяды» . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
Уладзімір Караткевіч. Раман «Каласы пад сярпом тваім» . . . . . . 63
Міхась Стральцоў. Апавяданне «Сена на асфальце» . . . . . . . . . 65
Ніл Гілевіч. «Паклон табе, мой беларускі краю!..» . . . . . . . . . 66
Ніл Гілевіч. Раман у вершах «Родныя дзеці» . . . . . . . . . . . . . 67

Іван Чыгрынаў. Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы" . . . . . . 68
Іван Навуменка. Апавяданне «Сямнаццатай вясной» . . . . . . . . . . 70
Рыгор Барадулін. Верш «Неруш» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Рыгор Барадулін. Верш «Чалавек не ўзнікае так...» . . . . . . . . . . 72
Алесь Разанаў. Лірыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
**Сучасная беларуская літаратура** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Казімір Камейша. «Дзве казкі» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
А. Зэкаў. «Як жыць» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Аляксей Дудараў. П'еса «Радавыя» (*урывак*) . . . . . . . . . . . . . . 83

**КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫЯ ЗАДАННІ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫНІКОВАГА КАНТРОЛЮ**

Беларуская літаратура перыяду 1960 — пачатку 1990 гадоў . . . . 88
Беларуская літаратура на сучасным этапе . . . . . . . . . . . . . . . 109
*Спіс выкарыстаных крыніц* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125